# Піянераў запрашаюць да ўдзелу ў новым анлайн-праекце “Пазнай Беларусь”

Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя 20 кастрычніка дае старт новаму анлайн-праекту “Пазнай Беларусь”, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА старшыня Цэнтральнага савета БРПА Аляксандра Ганчарова.

“Удзельнікамі праекта стануць піянеры і акцябраты ва ўзросце 7-14 гадоў. Юнакоў і дзяўчат чакае 6 месяцаў паглыблення ў гісторыю, традыцыі, прыроду Беларусі і многае іншае. Яны паспрабуюць прыгатаваць стравы беларускай нацыянальнай кухні, пашыць сваімі рукамі нацыянальную цацку, падзеляцца незвычайнымі традыцыямі роднага краю”, – расказала Аляксандра Ганчарова.

Выканаўшы заданні, піянеры павінны будуць выкладваць фота і відэасправаздачы на сваіх старонках у сацыяльных сетках з адзіным хэштэгам праекта #познайБеларусь. “Переможцаў і прызёраў конкурсу чакаюць незвычайныя прызы і дыпломы ад Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі”, – дадала старшыня ЦС БРПА.

Больш падрабязна азнаёміцца з умовамі ўдзелу ў праекце і прайсці рэгістрацыю можна на сайце арганізацыі.

БЕЛТА